Выпуск №122 (февраль, 2019)

# Большая перемена




Издается с декабря 2005 года

*Газета Государственного учреждения образования «Средняя школа №2 г. Калинковичи»*




*Я – беларус, мая родная мова – беларуская!*

**Васіль Быкаў**

## В ЭТОМ ВЫПУСКЕ

Цікавыя факты пра мову ............................ 2

Не маўчы па-беларуску! ... ............. 2

Бацькоўскі сход ............ 2

Дзень юнага героя-антыфашыста ... 3

Сустрэча з Вакуленка А.С. ................. 3

Вечар школьных сяброў ......... 3

Сустрэча з прадстаўнікамі Ваеннай акадэміі РБ..... 4

Тата, мама, я— спартыўная сям'я........... 4

Усміхніся............................ 4

# Дзень роднай мовы ў школе



*Удзельнікі конкурсу "Буслік—2019"*

***У лютым у свеце адзначаюць Міжнародны дзень роднай мовы. Для нашага народа такой спрадвеку з'яўляецца беларуская. Яна прайшла доўгі шлях, на якім былі як часы росквіту, так і заняпаду. Выпадалі нават такія перыяды, калі беларуская мова ледзь не знікла, аднак, нягледзячы на ўсе перашкоды, вытрымала выпрабаванні і цяпер займае сваё пачэснае месца сярод іншых моў свету.***

21 лютага ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. Цікава і пазнавальна прайшоў гэты дзень і ў нашай школе.

Вучні 3-8 класаў прынялі ўдзел у рэспубліканскім конкурсе "Буслік".

Займальны моўны турнір "Хто жадае стаць выдатнікам?" для вучняў 9 "А" падрыхтавала Дзмітрыенка А.У. "Знаўцы беларускай мовы" - пад такой назвай прайшла віктарына для вучняў 11 класа.

На кожным перапынку жадаючыя маглі прадэманстраваць сваё веданне беларускай паэзіі і прозы, прымаючы ўдзел у інтэрактыве "Адкрыты мікрафон". Самымі актыўнымі былі вучні 3 "А", 4 "А", а таксама вучаніца 1 класа Мужэнка Майя і вучаніца 5 "А" Колас Аляксандра.

На другім паверсе была наладжана выстава моўных карцінак "Дзіцячая заМова" паводле кнігі беларускага журналіста Глеба Лабадзенкі. З дапамогай малюнкаў вучні з лёгкасцю маглі зразумець розніцу паміж «стулам» і «крэслам», «сабе» і «сябе» і іншымі беларускімі словамі.

У гэты дзень у школе была наладжана фотазона "Я - Францыск Скарына".

Падчас акцыі "Мае любімыя словы" і вучні, і настаўнікі запісвалі на пялёстках свае любімыя беларускія словы. У выніку атрымаўся прыгожы букет са слоў. Як высветлілася, любімыя беларускія словы ў нашай школы ў гэтым годзе – Радзіма, калі ласка, шчасце.

***Макарэвіч Т.П.***

**Фотаздымкі мерапрыемстваў размешчаны на сайце школы (https://k-sosh-2.schools.by).**

ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ

# ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ ПРА МОВУ

*Бедны той, хто не мае скарбаў вечных - скарбаў душы.*
*Такі скарб, каторы ніхто і ніколі адабраць ад нас не здолее,*
*Гэта любоў да бацькаўшчыны, да свайго народа, да роднай мовы…*

**Цётка**

• **Літаратурная беларуская мова надзвычай багатая: па розных ацэнках, яна налічвае ад 250 000 да 500 000 слоў.**

• Беларускі філолаг Фёдар Янкоўскі вызначыў паміж беларускай і рускай мовамі 27 фанетычных адрозненняў, 43 марфалагічныя і болей за 20 сінтаксічных.

• **Скульптурным увасабленнем адметнасці нашай мовы з'яўляецца помнік літары «Ў» у Полацку (2003 год).**

• Сусветна вядомы польскі паэт Адам Міцкевіч, які нарадзіўся на Навагрудчыне, шанаваў беларускую мову і лічыў яе найбольш захаванай і гарманічнай з усіх славянскіх моў.

• **Паводле ЮНЕСКА, наша мова з'яўляецца самай мілагучнай пасля італьянскай.**

• Беларуская мова мае тры алфавіты: кірылічны, самы распаўсюджаны сёння, пачаў ужывацца ў XIV ст.; лацінка з'явілася ў XVI ст.; па-беларуску арабскай вяззю пісалі татары, якія аселі ў Беларусі пасля ардынскіх набегаў.

• **Венгерскі матэматык і лінгвіст Андраш Корнай апублікаваў у 2013 годзе навуковую працу «Лічбавая смерць моў». Ён вывучаў тыя сусветныя мовы, якія знаходзяцца пад пагрозай вымірання ў інтэрнэце і ў электронных прыладах. Беларускую мову вучоны аднёс да ліку бясспрэчна жывых.**

**Шануй, ведай, любі сваю родную мову!**




БАЦЬКАМ І ВЫПУСКНІКАМ

# БАЦЬКОЎСКІ СХОД паводле падрыхтоўкі да выніковай атэстацыі і ЦТ

*З мэтай азнаямлення бацькоў з правіламі і парадкам выніковай атэстацыі і цэнтралізаванага тэсціравання па вучэбным прадметам 16 лютага адбыўся бацькоўскі сход «Псіхолага-педагагічная падрыхтоўка вучняў і бацькоў да выніковай атэстацыі і ЦТ».*

На сходзе прысутнічалі настаўнікі-прадметнікі (Краўчанка Н.І., Канаш Н.Б., Дзмітрыенка А.У., Назаранка Н.В., Прыходзька А.А.), якія прааналізавалі падрыхтаванасць вучняў 9 і 11 класаў да школьных выпускных экзаменаў, а таксама прапанавалі рэкамендацыі бацькам па аказанні дапамогі дзецям падчас падрыхтоўкі да выніковай атэстацыі.

***Рэдкалегія***

БРПА

# ДЗЕНЬ ЮНАГА ГЕРОЯ-АНТЫФАШЫСТА

***У піянерскай дружыне імя Ц.І. Брагоніна прайшоў урачысты тэматычны збор, прысвечаны Дню юнага героя-антыфашыста “Мы іх ніколі не забудзем”.***

У актавай зале навучальнай установы сабраліся дзеці 5-7 класаў, для якіх было арганізавана выступленне вучняў школы, прысвечанае дадзенай тэматыцы.

Педагог-арганізатар Кашлачова Лііляна Віктараўна расказала дзецям, чаму менавіта 8 лютага адзначаецца Дзень юнага героя-антыфашыста, пазнаёміла прысутных з юнымі героямі Францыі, Алжыра, з маленькімі пасланцамі міру Самантай Сміт і Кацяй Лычовай, а таксама звярнула ўвагу піянераў на такія словы, як фашызм і антыфашызм.

Успомнілі прысутныя многіх тых сваіх равеснікаў, хто ў гады Вялікай Айчыннай вайны не шкадаваў сябе ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. А гэта Зіна Партнова, Ліда Вашкевіч, Уладзімір Дубінін, Марат Казей і інш.



Падчас правядзення збору піянеры ўшанавалі памяць юных герояў, якія загінулі за шчасце і свабоду Радзімы, мінутай маўчання.

У канцы мерапрыемства гімнам міру прагучала ў калектыўным выкананні песня “Сонечны круг”.

***Марыя Хахлова***

УРОК МУЖНАСЦІ

# СУСТРЭЧА З ВАКУЛЕНКА А.С.

***13 лютага ў школе адбылася сустрэча з воінам-інтэрнацыяналістам Вакуленка Анатоліем Сяргеевічам, якая была прысвечана да 30-годдзя вываду Савецкіх войск з Афганістана. На сустрэчы прысутнічалі вучні 8-10 класаў.***



З расказу настаўніка гісторыі Дулуб Н.П. хронікі фільмаў, размовы з удзельнікам той вайны вучні даведаліся, што афганская вайна— гэта важная веха ў гісторыі нашых узброеных сіл, старонка ў гісторыі нашай краіны. Гэта дні і годы, боль і страты, доблесць і гераізм нашых салдат і афіцэраў.

Воіны-інтэрнацыяналісты – пераемнікі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, адданыя высокім ідэалам, моцныя духам людзі. Яны з'яўляюцца для маладога пакалення прыкладам мужнасці і вернасці воінскаму абавязку.

***Анастасія Картавенка***

# *ВЕЧАР ШКОЛЬНЫХ СЯБРОЎ*



***Першая субота лютага — гэта заўсёды доўгачаканае і хвалюючае свята для тых, хто не забывае родную школу, сваіх настаўнікаў, аднакласнікаў і сяброў. Былыя выпускнікі, яны з нецярпеннем чакалі гэтай сустрэчы. Многія з іх пасля заканчэння школы раз’ехаліся па розных гарадах, многія ўжо даўно сталі настаўнікамі і бацькамі і прыводзяць у школу сваіх дзяцей. Але ў гэты дзень яны адклалі свае справы, і прыйшлі ў родную школу.***

У зале сабраліся юбілейныя выпускі—30, 15 гадоў. На сустрэчы прысутнічалі настаўнікі-ветэраны: Алісейка Тамара Ільінічна, Вілакова Надзея Аляксееўна. Тамара Ільінічна 60 гадоў назад сама закончыла СШ №2. Вечар сустрэчы — гэта не толькі сустрэча з былымі аднакласнікамі і педагогамі, але і яркія ўспаміны са школьнага жыцця. А ўспомніць, якімі яны былі, дапамаглі будучыя выпускнікі школы. Яны падрыхтавалі святочны канцэрт і мультымедыйную прэзентацыю «Якія маладыя мы былі», выкарыстаўшы архіўныя фотаматэрыялы мінулых гадоў.

***Вольга Дулуб***

Тираж 30 экземпляров



ГУО «Средняя школа №2
г. Калинковичи»

Адрес школы: 247710,
г. Калинковичи
Гомельской области,
ул. Пионерская, 27 Б

Телефон: +375 02345 23884

Email: guo.sosh2@mail.gomel.by

http://k-soch-2.schools.by

Учредители:
Администрация
ГУО «Средняя школа №2
г. Калинковичи»,
Совет Школы

Мы вместе!

## Усміхніся=



**- Ты чаму спазніўся? - пытаецца вучня настаўніца.**

**- Па дарозе ў школу на мяне напалі бандыты і абрабавалі.**

**- І што ж яны ў цябе ўзялі?**

**- Сшытак з хатнім заданнем.**

* * *

- Таму, хто пойдзе першым да дошкі, пастаўлю на бал больш.

- Іду! Стаўце мне тройку!

* * *

**Скажы мне, што ты чытаеш, і я скажу табе, хто ты.**

**- Цікава... Я вось чытаю Гамера, Платона, Сакрата...**

**- Трапло ты, Мікола.**

* * *

Урок беларускай мовы.

-Іваноў, якія ведаеш прыстаўкі?

- Sony PlayStation 3, Nin tento Wii? Xbox 360...

* * *

**Тэлефонны званок настаўніцы ў адну гадзіну ночы:**

**- Марыя Іванаўна, вы спіце?**

**- Так.**

**- А мы... вучым.**

ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

# СУСТРЭЧА З ПРАДСТАЎНІКАМІ ВАЕННАЙ АКАДЭМІІ



***14 лютага ў рамках прафарыентацыйнай работы адбылася сустрэча вучняў 9-11 класаў з прадстаўнікамі Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь.***

Вучняў пазнаёмілі з асноўнымі спецыялізацыямі акадэміі, умовамі прыему, умовамі навучання і сацыяльнымі гарантыямі. Старшакласнікам паказалі невялікі відэафільм аб Ваеннай акадэміі. Будучыя абітурыенты даведаліся многа цікавых фактаў з гісторыі стварэння акадэміі, жыцця вуза. Па заканчэнні сустрэчы ўсе выпускнікі атрымалі мноства розных буклетаў з дадатковай інфармацыяй.

***Рэдкалегія***

БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ

# «ТАТА, МАМА, Я— СПАРТЫЎНАЯ СЯМ'Я"



***У нашай школе шмат добрых традыцый. І адна з іх — лютаўскія школьныя спаборніцтвы "Тата, мама, я — спартыўная сям'я". Вось і 22 лютага спартыўная зала школы была запоўнена заўзятымі гледачамі, якія прыйшлі "пахварэць" за сямейныя каманды Шынкарчук (3 «Б»), Ракаўчук (4 «Б»), Серафімовіч (4 «А»). Арганізатар свята настаўнік фізічнай культуры і здароўя Бараноўскі Мікалай Уладзіміравіч.***

У склад журы ўвайшлі прэзідэнт школьнага самакіравання Лідзія Лысянкова, міністр падтрымкі малодшага звяна Даніла Хадорчанка. Спаборніцтвы пачаліся з прадстаўлення журы і каманд.

Удзельнікам трэба было пераадолець дыстанцыю з некалькіх станцый: "Боўлінг", "Скачкі ў даўжыню", "Пацэль у абруч", "Трапны стралок" і эстафеты. Амаль усе конкурсы былі накіраваны на згуртаванасць сем'яў, на падтрымку з боку ўсіх членаў, бо без гэтага нельга было выканаць заданне.

У выніку перамагла каманда Шынкарчук. Сем'і Ракаўчук і Серафімовіч сталі прызёрамі мерапрыемства.

***Уладзіслаў Кабраль***

Ответственный за выпуск Макаревич Т.П.